## Вучэбная дысцыпліна «Фанетыка - лексікалогія - словаўтварэнне»

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05 0113 -02 Філалагічная адукацыя. Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)<br>Цыкл спецыяльных дысцыплін: дзяржаўны кампанент* |
| **Кароткі змест** | Беларуская мова як найважнейшы элемент нацыянальнай культуры, духоўны скарб нацыі. Літаратурная мова як форма агульнанароднай мовы. Беларуская літаратурная мова і стылістычная дыферэнцыяцыя яе выкарыстання.Фанетыка, яе прадмет і задачы. Фанетычнае чляненне моўнай плыні. Гукі беларускай мовы, прынцыпы іх класіфікацыі. Склад як адзінка фанетыкі. Націск і інтанацыя як суперсегментныя адзінкі фанетыкі. Фаналагічная сістэма беларускай мовы. Арфаэпія, яе прадмет і задачы. Арфаэпічная норма і культура маўлення. Графіка, яе прадмет і задачы. Суадносіны паміж гукамі і літарамі. Арфаграфія, яе прадмет і задачы. Лексікалогія як раздзел лінгвістыкі. Асновы семасіялогіі. Адназначнасць і мнагазначнасць у лексічнай сістэме мовы. Міжслоўныя семантычныя сувязі. Лексіка беларускай мовы паводле сферы яе выкарыстання. Лексіка беларускай мовы паводле яе актыўнага і пасіўнага выкарыстання. Фарміраванне лексікі беларускай мовы. Фразеалогія, яе прадмет і задачы. Семантычная класіфікацыя фразеалагізмаў. Сістэмныя адносіны ў фразеалогіі. Фразеалагічны склад беларускай мовы. Фразеаграфія, яе прадмет і задачы. Лексікаграфія як раздзел лінгвістыкі. Марфемы, іх класіфікацыя паводле значэння. Класіфікацыя марфем паводле ролі ў складзе слова. Аснова слова. Словаўтварэнне як раздзел мовазнаўства. Спосабы словаўтварэння і іх разнавіднасці. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | Ведаць: змест асноўных лінгвістычных паняццяў; артыкуляцыйныя і акустычныя характарыстыкі гукаў, складовую і акцэнтную структуру слова, класіфікацыю фанем; беларускія арфаэпічныя нормы; прынцыпы беларускай графікі, сродкі беларускай графікі; прынцыпы беларускай арфаграфіі, арфаграфічную сістэму беларускай мовы; адзінкі лексічнага ўзроўню, семантычную структуру слова; функцыянаванне і паходжанне лексікі беларускай мовы, сістэмныя адносіны на лексічным узроўні; адзінкі фразеалагічнага ўзроўню, ідыяматычнасць, тыпы фразеалагізмаў, функцыянаванне; марфемную структуру слова, тыпы марфем, змены ў марфемнай структуры слова;спосабы словаўтварэння, словаўтваральныя мадэлі. Студэнты павінны ўмець: карыстацца лінгвістычнай тэрміналогіяй: дыферэнцыраваць асноўныя моўныя адзінкі; характарызаваць моўныя адзінкі з пункту іх семантыкі, структуры і функцыі; праводзіць фанетычны, лексічны, марфемны, словаўтваральны аналіз слова; самастойна працаваць з навукова-даведачнай і метадычнай літаратурай па мовазнаўстве. Студэнты павінны валодаць: нормамі вуснага і пісьмовага маўлення сучаснай беларускай літаратурнай мовы; паняццямі і тэрмінамі ў іх сістэмна-структурных сувязях; формамі і метадамі лінгвістычнага аналізу рознаўзроўневых моўных адзінак; маўленчай дзейнасцю ў сістэме стылёва-функцыянальных разнавіднасцей беларускай літаратурнай мовы; навыкамі выяўлення і аналізу моўных адзінак у тэкстах;навыкамі карыстання навуковай, даведачнай і метадычнай літаратурай па беларускім мовазнаўстве; сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання, інфармацыйнымі і камп'ютарнымі тэхналогіямі ў працэсе самастойнага назапашвання ведаў па мове. |
| **Прэрэквізіты** | Уводзіны ў мовазнаўства |
| **Працаёмкасць** | 216 гадзін, з іх аўдыторных – 124 гадзіны, з якіх: лекцыйных – 62 гадзіны (28 гадзін у першым семестры, з іх 4 гадзіны на КСР, 34 гадзіны ў 2 семестры, з іх 4 гадзіны на КСР ), практычных заняткаў – 62 гадзіны (28 гадзін у першым семестры, 34 гадзіны ў другім). (колькасць залікoвых адзінак – 3). |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | экзамен у 1 семестры, залік у 2 семестры, тэсціраванне |